Станаўленне беларускай савецкай этнаграфічнай школы даследавання праблемы сям’і (50-70-я гг. ХХ ст.) // Весці НАН Беларусі. – 2010. – № 4. – С. 91-97.

**УДК 392/.394(476)**

# Станаўленне беларускай савецкай этнаграфічнай школы даследавання праблемы сям’і (50–70-я гг. ХХ ст.)

Зварот да вывучэння перыяду фарміравання савецкай этнаграфічнай школы, якая займалася вывучэннем праблемы сям’і, звязаны з тым, што сёння наша дзяржава прыкладае шмат намаганняў для ўмацавання сямейных адносінаў у сям’і. Сапраўды, моц краіны грунтуецца на стабільнасці сямейных стасункаў, дабрабыце бацькоў і дзяцей. Нягледзячы на тое, што ў працах этнографаў савецкага часу прысутнічаюць ідэалагічныя штампы, якія ўжо не вытрымалі праверку часам, нельга адмовіць факт, што гэта быў перыяд выпрацоўкі падыходаў да навуковага даследавання сямейнага асяродку, час фарміравання навуковых традыцый вывучэння сям’і.

Пошук напрамкаў і методыкі вывучэння сям’і беларусаў у савецкі час праглядаецца ў да- і пасляваенныя гады. У 20–30-я гг. сям’я беларусаў не аналізавалася ў асобных працах. Збор некаторых звестак пра яе прадугледжваўся ў праграмах комплексных апісанняў вёсак, раёнаў, формаў развіцця гаспадарак. Новы статус жанчыны ў сям’і, лейтматыў кардынальнага падзелу ў адлюстраванні старога і новага побыту, усталяванне іншых унутрысямейных адносінаў – новыя з’явы, на якія звярнулі ўвагу краязнаўцы.

Першай спробай выяўлення новых з’яў у сямейным побыце пасляваеннага перыяду з’яўляецца даследаванне змяненняў у сем’ях калгаса “Бальшавік” Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці [1]. М.Я.Грынблат і Л.А.Малчанава сканцэнтравалі ўвагу на выяўленні асноўных рыс, якія прынцыпова адрозніваюць новую мадэль сялянскай сям’і ад старой. Дзеля тэрміналагічнай вызначанасці аўтары ўводзяць у навуковы зварот паняцце сацыялістычнага тыпу сям’і – калгасная сям’я.

Новымі з’явамі ў сямейным быце калгаснікаў даследчыкі называюць наступныя: змяненне сацыяльна-эканамічнай асновы сялянскай сям’і, дэмакратызм унутрысямейных стасункаў, распрыгоненне жанчыны-сялянкі, трансфармацыя сацыяльна-эканамічнай прыроды прымацтва. Тут закранаюцца таксама пытанні выхавання, адукацыі школьнікаў як дзяржаўна-сямейныя задачы.

Але, на нашу думку, аўтары аднабакова сцвярджаюць, што ўвесь сямейны быт калгасніка вызначаецца грамадскай працай і вучобай [1, с. 72]. Гэта значыць, што даследчыкі ў значнай ступені атаясамліваюць дыялектычна звязаныя сферы грамадскага і сямейнага побыту.

А.І.Залескі ўзняў новую ў беларускай этнаграфіі праблему даследавання – быт сялян (у тым ліку і сямейны) у партызанскім краі [2]. Крыніцазнаўчую базу яго манаграфіі склалі матэрыялы, сабраныя ў этнаграфічных экспедыцыях, а таксама падпольныя бальшавіцкія газеты “Звязда”, “Чырвоная змена”, “Кліч Радзімы”, кнігі ўспамінаў удзельнікаў партызанскага руху. Тут закранаюцца такія пытанні, як змяненне памераў і складу сям’і за перыд Вялікай Айчыннай вайны, ілюструецца складанасць працэсаў, што былі звязаны са змяненнем колькаснага складу сям’і, характарызуюцца ўзаемаадносіны паміж членамі сям’і, сваякамі, староннімі людзьмі (бежанцамі) і інш.

Праблема ўплыву вайны на быт насельніцтва з’яўляецца маларaспрацаванай у гісторыі айчыннай этналагічнай навукі. Храналагічны падыход у яе асвятленні А.І.Залескім, біяграфічная дакладнасць чалавечых лёсаў на лакальнай тэрыторыі (Любаншчына) спалучаюцца з аўтарскім імкненнем адлюстраваць глыбіню псіхалагічна-эмацыянальнай напружанасці часу ваенных ліхалеццяў.

Шматграннае вывучэнне некаторых з’яў у пасляваенным побыце беларускіх калгаснікаў належыць таму ж даследчыку [3]. Храналагічна праца ахоплівае дзесяцігоддзе (1946–1955 гг.) і грунтуецца на палявым

этнаграфічным матэрыяле, сабраным у шасці населеных пунктах Беларускага Палесся [3, с. 123].

Аўтар закранае такія пытанні, як структура сям'і і сямейных адносінаў, роля жанчыны-галавы сям'і, ўзаемаадносіны паміж сваякамі, гадаванне і выхаванне дзяцей, роля дзяржавы ў арганізацыі выхаваўчых і навучальных установў для дзяцей воінаў Савецкай Арміі і партызанаў Айчыннай вайны.

Праблема даследавання працэсу фарміравання сацыялістычнага побыту сялянства знайшла вырашэнне ў шэрагу прац 60-х гг. XX стагоддзя. Аўтарскі аналіз новых з'яў, што пачалі нараджацца ў грамадскім і сямейным побыце беларускіх калгаснікаў, правяла Г.І.Дулеба [4]. Аб'ектам вывучэння абраны 4 калгасы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Метадалагічны арсенал Г.І.Дулебы ўключаў два асноўныя метады вывучэння – назіранні-гутаркі з інфарматарамі і анкетнае абследаванне 581 сям'і.

Аўтар вызначыла карэнныя змены ў сямейным побыце калгаснікаў Барысаўшчыны: змяненне становішча галавы сям'і, раўнапраўе жанчыны, фарміраванне дэмакратычных унутрысямейных стасункаў, акрэслены пачатак мадэрнізацыі ў сферы сямейных звычаяў і абрадаў.

Асобную брашуру Г.І.Дулеба прысвяціла асвятленню пытання становішча жанчыны на Беларусі ў да- і паслякастрычніцкі перыяды [5]. Значную ўвагу аўтар адводзіць фактычнаму паказу ролі маладой дзяржавы і адукацыі ў працэсе павышэння аўтарытэту жанчыны ў грамадстве, разбурэння стэрэатыпных поглядаў на падначаленае становішча жонкі ў сям'і.

Наватарскі падыход да вывучэння сямейнага побыту беларусаў у творах Якуба Коласа дасавецкага перыяду назіраецца ў даследаваннях Э.Р.Сабаленкі [6]. Аўтар яскрава ілюструе літаратурнымі прыкладамі са збору твораў Якуба Коласа ўвесь спектр этнаграфічна цікавых замалёвак клапатлівага жыцця сялянскай сям'і дакастрычніцкай беларускай вёскі, прыкмячае відавочны рацыяналізм сямейных рашэнняў у пытаннях працы,

шлюбу, выхавання дзяцей, асобна разглядаюцца аўтарам вобразы жанчынысялянкі з яе падвойным (сацыяльным і хатнім) прыгнётам.

Праблема мастацкага этнаграфізму, дакладней узаемаўплыву этнаграфіі і мастацкай літаратуры, узнята Э.Р.Сабаленкай у працы “Этнаграфічная спадчына Якуба Коласа” [7]. Тут утрымліваецца адлюстраванне пытанняў вытворчай дзейнасці, матэрыяльнай культуры, грамадскага і сямейнага быту беларускага сялянства ў дакастрычніцкі і савецкі час на падставе паэтычных і празаічных твораў пісьменніка. Трапным назіраннем з’яўляецца адзначанае разыходжанне ў ацэнцы становішча сямейнай жанчыны ў мастацкай і этнаграфічнай літаратуры з тым, як гэта зроблена Якубам Коласам. Калі першыя крыніцы ў большасці выпадкаў прадставілі яе залежнай і бяспраўнай, то ў пісьменніка яна – адносна самастойны чалавек, які меў права голаса пры вырашэнні сямейных пытанняў [7, с. 113].

Сучасны шлюб і вяселле рабочых становіцца прадметам вывучэння У.М.Іванова [8]. Крыніцазнаўчую базу склалі аўтарскае даследаванне 448 сем’яў горада Мінска, а таксама статыстычная апрацоўка кніг рэгістрацыі шлюбаў Кастрычніцкага раёна сталіцы за 1956 год. Аўтар справядліва адзначае сутнасную змену шлюбу як саюза няроўных у дакастрычніцкі перыяд і юрыдычнае раўнапраўе мужчыны і жанчыны, пацверджанае савецкім шлюбным заканадаўствам.

Комплекснае даследаванне побыту рабочых горада Мінска прадстаўлена ў абагульненай працы У.М.Іванова [9]. Аб’ектам вывучэння былі абраны сем’і працоўных вядучых прадпрыемстваў сталіцы: чыгуначнага вузла, завода “Бальшавік”, завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі з мэтай выяўлення новага, камуністычнага пачатку ў сям’і.

Аўтар выкарыстаў метад стацыянарнай палявой работы, дзе асноўная ўвага надавалася асабістым назіранням, размовам, прыёмам непасрэднага вывучэння працоўных сем’яў з выкарыстаннем пасямейнай карткі і аўтарскай пасямейнай анкеты [9, с.6].

У.М.Іваноў закранае такія пытанні, як шлюб, віды вяселляў, форма сям'і, колькасны склад, унутрысямейныя адносіны, новая мараль, грамадзянскія інавацыі ў сямейных звычаях і абрадах (радзіны, вяселле, пахаванне), культурны ўзровень працоўных.

Аднак тут прысутнічае залішняя пафаснасць. Так, пры вызначэнні ідэалу мужа і жонкі У.М.Іваноў на першае месца вылучае не чалавечыя пачуцці і якасці, а грамадскія характарыстыкі працаўніка, перадавіка, члена брыгады камуністычнай працы і г.д. [9, с. 19].

Праблема неэфектыўнага выкарыстання жаночых працоўных рэсурсаў у вытворчасці, звязаная з бытавой няроўнасцю жанчыны ў сям'і, узнята ў артыкуле В.М.Ткачэнкі "Аб шляхах ліквідацыі рэшткаў бытавой няроўнасці жанчын" [10]. Цікавую па змесце і ўдалую па форме выканання, сугучную ідэю вывучэння характару маладой сям'і, падаў У.М.Іваноў у артыкуле "Рэшткі бытавой няроўнасці жанчыны і меры па найхутчэйшай іх ліквідацыі" [11]. Адказы на пытанні, дасланыя чытачамі газеты "Знамя юности" дазволілі даследчыку зрабіць "этнаграфічную мазаіку", якая па змесце значна пашырае і паглыбляе праблему нераўнапраўнага размеркавання сямейных абавязкаў сужэнцаў. Як і В.М.Ткачэнка, У.М.Іваноў бачыць яе вырашэнне ў комплексным падыходзе.

У гісторыю айчыннай этналогіі У.М.Іваноў увайшоў як даследчык-гістарыёграф праблемы побыту і культуры рабочага класа Беларусі. Гісторыка-этнаграфічнае даследаванне "Сям'я і сямейны быт рабочага класа XIX–1970 гг." прысвечана вывучэнню развіцця побыту і культуры прамысловых рабочых Беларусі [12]. Значная ўвага належыць даследаванню сямейнай сферы ў перыяд будаўніцтва камунізму. Назіранні, анкетнае апытанне, гутаркі, стандартызаваныя інтэрв'ю, вывучэнне асабістых дакументаў, а таксама выкарыстанне ілюстратыўных матэрыялаў (фота, замалёўкі) забяспечылі комплексны падыход вывучэння прадмета даследавання. У асвятленні сямейнага побыту аўтар спыніўся на пытаннях колькасна-сваяцкага складу, унутрысямейных узаемаадносінах, інстытуцыі

галавы сям'і, сямейных традыцыях, звычаях і абрадах. Асобныя аспекты прадстаўлены ў параўнанні з сялянскай сям'ёй (маральна-бытавое і гаспадарчае становішча жанчыны, ступень падобнасці і інш.).

Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прадстаўлена эканамічнае даследаванне структуры сямейных бюджэтаў праз аналіз суадносінаў прыбыткаў і выдаткаў працоўнай сям'і, дынамікі змяненняў выдатковай часткі бюджэтаў за гады Савецкай улады [12, с.22].

Метадам выпадковага адбору і стандартызаванага інтэрв'ю выяўлены погляды рэспандэнтаў на шлюб і яго этычную матывацыю, будучую сям'ю і г.д. Тут закранаецца і скразная праблема навуковай спадчыны У.М.Іванова – ліквідацыя рэшткаў бытавой няроўнасці жанчыны. У кірунку выяўлення змястоўных зменаў, а таксама сучасных формаў бытавання прадстаўлена вясельная і радзінная абраднасць.

60-я гг. ХХ ст. увайшлі ў гістарыяграфію праблемы беларускай сям'і як час узнікнення новага прынцыпу класіфікацыі вясельнай абраднасці. Праблема навуковага аналізу традыцыйнага вясельнага цыкла, пастаўленая М.В.Доўнар-Запольскім у 1893 годзе, атрымала другую спробу вырашэння ў манаграфіі М.М.Нікольскага "Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці" [13].

Рознасць тэарэтыка-філасофскай базы М.В.Доўнар-Запольскага (ідэалістычны эвалюцыянізм) і М.М.Нікольскага (гістарычны матэрыялізм) адбілася на выніках прымянення ў гэтых працах тоеснага метадалагічнага інструментарыя. Гісторыка-параўнальны метад быў выкарыстаны абодвума вучонымі для вырашэння неаднолькавых з метадалагічнага пункту гледжання задач узнятай навуковай праблемы.

Так, ідэя выяўлення агульных заканамернасцей у гісторыі некаторых славянскіх шлюбных абрадаў у параўнальна-гістарычным кантэксце з аналагічнымі еўрапейскімі абрадамі (усходне-, заходне-, паўднёваславянскіх і неславянскіх народаў) падштурхнула М.В.Доўнар-Запольскага да пошуку паралеляў у сучаснай і мінулай абраднасці індаеўрапейскіх народнасцей.

М.М.Нікольскі будуе працу пераважна на ўсходнеславянскім матэрыяле, спрабуючы паказаць гістарычныя змены ў старажытнарускай першааснове, а таксама растлумачыць прычыны ўзнікнення і спецыфіку беларускай мадэлі вясельнай абраднасці.

Суб'ектывызм у вылучэнні старажытных элементаў вясельнага цыкла М.В.Доўнар-Запольскага, на нашу думку, тлумачыцца дамінуючай роляй аналогіі як формы мыслення і гістарычнага пазнання. Праца М.М.Нікольскага напісана з пазіцый дыялектычнага светаўспрымання, што дазволіла пераемніку зменшыць адвольную фрагментарнасць папярэдніка, больш канкрэтна праілюстраваць сувязь рэлігійна-абрадавых і сацыяльна-побытавых элементаў вясельнага цыкла.

Прадстаўлены М.В.Доўнар-Запольскім рэлігійны пачатак як выснова абраднасці быў прыняты і яго пераемнікам. М.М.Нікольскі дапоўніў вывады папярэдніка за кошт павелічэння крыніцазнаўчай базы ўласнага даследавання, на падставе якой былі вылучаны формы і варыянты існавання стрыжнёвых абрадаў, больш дакладна высветлена паходжанне састаўных элементаў падрыхтоўчага этапа (класіфікацыя па эпохах і стадыях), перанесена ядро вясельнага цыкла з абраду пасада на абрад злучэння маладых, распрацаваны версіі стаўбавой і каравайнай абраднасці.

М.М.Нікольскі робіць тэрміналагічныя карэктывы ў вызначэнні вялікай і малой сям'і, дадзеныя М.В.Доўнар-Запольскім 63 гады таму, і звязвае існаванне каравайных і стаўбавых вясельных рытуалаў як спецыфічна беларускіх з сацыяльна-эканамічнымі формамі сям'і і абшчыны, геаграфіяй іх распаўсюджвання.

Аднак у абодвух даследчыкаў праглядаецца метадалагічная абмежаванасць абраных прынцыпаў вывучэння, што стала асноўнай перашкодай прадставіць вясельны цыкл як сістэму. Мэта М.В.Доўнар-Запольскага "выбраць цікавыя з этнаграфічнага пункту гледжання факты і паставіць іх у сувязь з паралельнымі фактамі з рытуалаў індаеўрапейскіх народнасцей" прадугледжвала толькі пошук і высвятленне паходжання,

тлумачэнне сутнасці вясельных звычаяў і абрадаў [14, с. 62]. Умоўная паслядоўнасць аналізу прадмета вывучэння М.М.Нікольскага тлумачылася колькаснай задачай этнографа выявіць стрыжнёвы склад вясельнай абраднасці. Агляд, заснаваны на “адборы асноўных абрадаў незалежна ад месца іх правядзення” не даў магчымасці вызначыць узаемасувязь функцыянавання элементаў сістэмы [13, с. 42].

М.М.Нікольскі зрабіў крок наперад у кірунку распрацоўкі ўласнабеларускай мадэлі гісторыі вясельнай абраднасці, але адсутнасць міждысцыплінарнай факталагічнай базы прымусіла даследчыка аддаць перавагу аднаму тыпу крыніц. Прасочаная М.М.Нікольскім паэтапная спецыфіка двух распаўсюджаных варыянтаў выканання вяселля стала высновай для аналізу паходжання і зместу стаўбавой і каравайнай абраднасці беларусаў. Вывучэнне гэтага пытання, на нашу думку, павінна ўключаць дадзеныя комплексу грамадскіх і лінгвістычных дысцыплінаў, фактычна пацверджаныя ў этналагічных працах.

Такім чынам, другая спроба класіфікацыі вяссельнай абраднасці з’яўлялася якасна новай па ўзроўні філасофска-тэарэтычнай падрыхтоўкі даследчыка. Хаця цалкам праца М.М.Нікольскага не парушыла традыцыю вывучэння сямейнай абраднасці з яе рэлігійнай асновай.

Вывучэнне сям’і і шлюбу ў беларускіх сялян другой паловы ХІХ–пачатку ХХ стагоддзя М.Ф.Піліпенка засяроджвае на даследаванні агульных і спецыфічных рысаў эканамічнай асновы і формаў сям’і на Беларусі, шлюбных звычаях і абрадах, тлумачэнні сутнасці, зроблена спроба іх класіфікацыі з улікам структурнага, функцыянальнага і генетычнага параметраў [15, с. 3].

Крыніцазнаўчай базай працы паслужылі друкаваныя матэрыялы па сацыяльна-гаспадарчай дзейнасці і сямейна-побытавым укладзе беларускіх сялян, статыстычныя звесткі, дадзеныя Беларускай этнаграфічнай экспедыцыі кафедры МДУ 1966 года, сабраныя ў шасці раёнах БССР, а таксама вынікі апрацоўкі матэрыялаў па ўласна аўтарскай праграме збору.

Значна павышаюць навуковую каштоўнасць даследавання параўнальна-этнаграфічнае супастаўленне дадзеных па сямейным побыце беларусаў і некаторых усходне-, заходне- і паўднёваславянскіх народаў [15, с.8].

Варта адзначыць, што ў гісторыі айчыннай этналогіі праблема навуковага вывучэння сямейнай абраднасці паўставала заўсёды. Кожны з этапаў адметны пэўным выкарыстаннем метадалагічнага інструментарыя і ўскладненнем задач прадметнага даследавання. Так, калі 50–70-я гг. XIX ст. характарызаваліся накапленнем фактычнага матэрыялу, у 80-я гг. XIX–пачатку XX стст. з’явіліся спробы гісторыка-параўнальнага аналізу сямейнай абраднасці, у савецкі час распрацоўвалася грамадзянская абраднасць і даследавалася традыцыйная, апошнія дзесяцігоддзі XX ст. адметны вяртаннем да вывучэння традыцыйных мадэляў бытавання сямейнай абраднасці XIX–пачатку XX стст., аналізам сучаснага стану (форма і распаўсюджанне) прадмета даследавання.

Першая спроба гістарыяграфічнага аналізу прац па сямейным і грамадскім побыце беларусаў належыць В.К.Бандарчыку [16]. Храналагічныя межы ахопліваюць 20–60-я гады XX ст. Крыніцазнаўчую базу склалі газетныя і часопісныя артыкулы, брашуры, манаграфіі айчынных этнолагаў. Найбольш важная заслуга даследчыка заключаецца ў крытычнай ацэнцы новай канцэпцыі паходжання і гісторыі беларускай вясельная абраднасці М.М.Нікольскага як з боку метадалогіі, так і з боку падачы фактычнага матэрыялу. В.К.Бандарчык першы адзначыў мяжу ідэалістычнай і матэрыялістычнай канцэпцый вывучэння вясельнай абраднасці ў навуцы.

Комплекснае вывучэнне бягучых працэсаў развіцця грамадства знайшло адлюстраванне ў калектыўнай мнаграфіі “Змены ў быце і культуры гарадскога насельніцтва Беларусі” [17]. Геаграфічна даследаванне ахоплівае дзве вобласці рэспублікі – Мінскую і Гомельскую. Дадаткова анкетным апытаннем паглыблена вывучаліся некаторыя з’явы сямейнага быту сярод прадстаўнікоў буйных прадпрыемстваў і чытачоў рэспубліканскай газеты “Знамя юности”, шматтыражных газет “Трактор”, “Автозаводец”. Аўтары

ставілі задачу высветліць агульныя тэндэнцыі зменаў у сямейным і грамадска-культурным асяродку гарадскога насельніцтва.

Выкарыстанне комплекснай метадалогіі з прымяненнем традыцыйных этнаграфічных метадаў – назіранні, мэтавыя нестандартызаваныя інтэрв’ю, анкетныя апытанні – і сацыялагічнай методыкі апрацоўкі колькаснага матэрыялу на ЭВМ – першая спроба міждысцыплінарнага падыходу ў вывучэнні шматкампанентнага прадмета даследавання. У працы выкарыстаны статыстычныя дадзеныя вучоных-дэмографаў па тэматычна сумежных пытаннях. Яшчэ адной прынцыпова новай рысай комплекснага даследавання з’яўляецца інтэграцыя здабыткаў этналогіі з іншымі грамадскімі і прыродазнаўчымі дысцыплінамі – генетыкай, медыцынай, юрыспрудэнцыяй, антрапалогіяй, педагогікай і інш. Спасылкі на дадзеныя такіх крыніц, прычым як на беларускія, так і на расійскія, значна ўзбагацілі змест і навуковую каштоўнасць працы.

Станоўчым момантам у высвятленні розных аспектаў паўсядзённага жыцця з’яўляецца дыферэнцыяцыя гарадскога насельніцтва па трох сацыяльных групах – рабочыя, служачыя і інтэлігенцыя. Такі падыход дазволіў зрабіць дэталёвую характарыстыку агульных перабудовачных тэндэнцый з улікам сацыяльна-прафесійных, адукацыйных, полаўзроставых, сваяцкіх і іншых параметраў.

Адзначаная праца з’яўляецца наватарскай не толькі ў плане этнасацыялагічнага міждысцыплінарнага падыходу, але і ў тым, што аўтары ўводзяць у навуковы абарот тэрміналогію па праблеме сям’і. Так, у манаграфіі акадэмічнае тлумачэнне атрымалі краевугольныя паняцці шлюбу і шлюбных аднсінаў, сям’і і сямейных стасункаў у кантэксце дыялектычнай сувязі з сацыялістычным базісам, акрэслены тыпы сямейных калектываў у залежнасці ад жыццёвых фазаў іх утваральнікаў.

Праблема выяўлення прынцыпова новых зменаў у сямейным быце гарадскога насельніцтва вырашана праз вывучэнне каштоўнасных

арыентацый гараджан, матывацыі і маралі сучаснага шлюбу, функцый і структуры сям’і, навацый у сямейнай абраднасці.

Уключэнне ў даследаванне функцыянальна-структурнай кампаненты дазволіла вызначыць характар сямейнага калектыву сацыялістычнага грамадства ў Мінскай і Гомельскай вобласці. Сярод найбольш важных функцый вылучаны гаспадарча-эканамічная, узнаўлення насельніцтва, выхавання маладога пакалення, арганізацыя вольнага часу сям’і [17, с. 14]. Шэраг аспектаў па структуры дамінуючай малой (нуклеарнай) сям’і на Беларусі высветлена пры дапамозе сацыялагічных метадаў даследавання: сваяцкі, колькасны і пакаленны склад, дзетнасць.

Сярод новых з’яў ва ўнутрысямейных адносінах адзначаны пераход стрыжнёвага зместу сямейна-шлюбных адносінаў з матэрыяльна-эканамічнага боку да духоўных каштоўнасцей, знікненне аўтакратыі ў інстытуцыі галавы сям’і, устойлівая тэндэнцыя да дэмакратызацыі сямейных стасункаў, антырэлігійная накіраванасць савецкай сямейнай абраднасці. Уключэнне ў даследаванне функцыянальна-структурнай кампаненты дазволіла вызначыць характар сямейнага калектыву сацыялістычнага грамадства ў Мінскай і Гомельскай вобласці. Сярод найбольш важных функцый вылучаны гаспадарча-эканамічная, узнаўлення насельніцтва, выхавання маладога пакалення, арганізацыя вольнага часу сям’і [17, с. 20-30].

Чарговы XXV з’езд КПСС вызначыў адзін з кірункаў развіцця даследаванняў у вобласці грамадскіх навук – распрацоўка праблем, звязаных з фарміраваннем сацыялістычнага ладу жыцця. У 1976 годзе была выдадзена калектыўная манаграфія, прысвечаная вывучэнню зменаў у побыце і культуры сельскага насельніцтва Беларусі [18]. Сямейны побыт разглядаўся як адзін са складнікоў грамадства. Аўтары бачылі сваю задачу ў тым, каб выявіць бягучыя змены ў шлюбных адносінах, функцыях сям’і, а таксама форме, колькасным складзе і ўнутрысямейных стасунках, разгледзець станаўленне новай сямейнай абраднасці.

Этнасацыялагічнае даследаванне праводзілася шляхам анкетнага апытання і індывідуальнага інтэрв'юіравання. Міждысцыплінарны падыход дазволіў выявіць не толькі агульныя, але і рэгіянальныя тэндэнцыі, дзякуючы ўключэнню больш шырокай геаграфічнай сеткі аб'ектаў даследавання: Мінская, Брэсцская, Гомельская, Віцебская вобласці рэспублікі. Супастаўленне атрыманых сацыялагічных вынікаў з агульнастатыстычнымі вызначыла глыбіню аналізу матэрыялу.

Больш даўняя гісторыя існавання на Беларусі сельскай сям'і – выснова для разгляду аб'екта вывучэння ў дынаміцы. Па сутнасці, у манаграфіі ўпершыню гісторыка-параўнальнае асвятленне атрымалі такія пытанні, як шлюб і яго формы, шлюбны ўзрост і яго полаўзроставая спецыфіка, шлюбныя стасункі, гістарычная трансфармацыя сістэмы матывацыі шлюбу і функцый сям'і, раскрыты прычыны парушэння этнацэнтрызму шлюбных стасункаў і строгай сацыяльнай гамагаміі шлюбу, адзначана тэндэнцыя росту колькасці міжэтнічных шлюбаў.

Структурна-функцыянальны аналіз сельская сям'і атрымаў у манаграфіі грунтоўную распрацоўку з-за ўдалага разгляду дынамікі развіцця сям'і і як сацыяльнага інстытута, і як адзінкавай з'явы. Адметна, што аўтары працягнулі распрацоўку тэрміналагічнага арсеналу па сямейнай праблематыцы: у навуковы абарот уведзены паняцці цыкла развіцця сям'і – першасная, другасная, трацічная – прапанавана класіфікацыя функцыянальнай сістэмы сям'і ў яе гістарычнай дынаміцы. Атрыманыя этнасацыялагічныя дадзеныя яскрава ілюструюць працэсы скарачэння вытворчай і гаспадарча-эканамічнай функцыі, узмацненне выхаваўчай, культурнай і эмацыянальнай нагрузкі [18, с. 25-30].

На працягу 50–70-х гг. XX ст. адбывалася станаўленне беларускай савецкай школы даследаванняў сям'і. Калі 50-я гг. у большай ступені вызначаліся як час пасляваеннага ўзнаўлення навуковага патэнцыялу і "сціплых" спроб апісання новых зменаў у сям'і, то на працягу 60–70-х гг. праглядаецца стабільны ход вывучэння, тэматычнае і метадалагічнае

пашырэнне падыходаў даследавання. На працягу 70-х гг. значна ўзбагачаюцца даследаванні праблемы: пашыраецца метадалагічны арсенал сродкаў вывучэння, замацоўваецца міждысцыплінарнасць як якасна новы падыход у вырашэнні навуковых задач, павялічваецца крыніцазнаўчая база.

Дыялектычны падыход у разуменні сутнасці сацыяльных з'яў пацясніў былых эвалюцыяністаў з іх спрошчаным разуменнем лінейнага развіцця культуры ад ніжэйшых формаў да вышэйшых, значна пашырыў аспектнае кола вывучэння бягучых працэсаў на ўзроўні сям'я – дзяржава.

Этнасацыялагічная методыка даследавання – новая і ўжо трывала замацаваная традыцыя айчыннай гістарыяграфіі. Яе выкарыстанне дало магчымасць навукоўцам не толькі вызначыць вектар эвалюцыі сацыяльных зменаў, але і прадставіць іх колькасную характарыстыку. Значнае пашырэнне маштабу даследаванняў, як і з'яўленне новых формаў працы – калектыўныя экспедыцыі, – абумовілі сістэмнасць і цэласнасць аналізу прадмета праз дыферэнцыяцыю праблемы, усталяванне ўласных навуковых традыцый не толькі на ўзроўні метадалогіі, але і ў аспектным плане. Так, вызначаная яшчэ ў 70-я гг. комплексная характарыстыка сельскай і гарадской сям'і з асобным этнасацыялагічным аналізам формы, тыпу сям'і, структуры (колькасны, пакаленны і сваяцкі склад), унутрысямейных узаемаадносінаў, функцый сямейнага мікраасяродку, зменаў у сямейнай абраднасці да сённяшняга дня прынята ў якасці базавага фундамента вывучэння шматаспектнай праблемы сям'і.

Такім чынам, на працягу 50–70-х гг. ХХ ст. назіралася ўзнаўленне даследаванняў па разглядаемай праблеме, выпрацоўка і замацаванне навуковых традыцый вывучэння. Упершыню адбылося станаўленне дыферэнцыяванага падыходу даследаванняў гарадской і сельскай сям'і. Сям'я і сямейная абраднасць рабочага класа распрацавана па тых жа аспектах, што і традыцыйная сям'я беларусаў. Этнолагі звярнуліся да такіх пытанняў, як уплыў Вялікай Айчыннай вайны на побыт насельніцтва, новыя з'явы ў сямейным побыце пасляваеннага перыяду, фарміраванне сацыялістычнага ладу жыцця ў грамадстве і сям'і. Асобны напрамак склалі працы па гісторыі сям'і і шлюбу беларусаў.

## Літаратура:


1. Грынблат, М.Я., Малчанава Л.А. Новыя з'явы ў быце калгаснай вёскі. Сямейны быт калгаснікаў // Беларускі этнаграфічны зборнік / Ін-т мастацтвазнўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР. 1958. Вып. 1. С.67-80.
2. Залескі, А.І. Быт беларускіх сялян у партызанскім краі. Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР. 1960. 210 с.
3. Залескі, А.І. Аб некаторых з'явах у пасляваенным сямейным быце беларускіх калгаснікаў // Беларускі этнаграфічны зборнік / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР. 1958. Вып. 1. С. 122-140.
4. Дулебо, А.И. Современный общественный и семейный быт белорусских колхозников: Автореф. дис. …канд.ист.наук: 07.00.07 /АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. Минск. 1966. 24 с.
5. Дулебо, А.И. Изменение положения белорусской женщины-крестьянки за годы Советской власти / Мин. обл. орг. о-ва «Знание». Минск. 1969. 24 с.
6. Сабаленка, Э.Р.Грамадскі і сямейны быт беларусаў у творах Якуба Коласа // Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: В.К.Бандарчык і інш. Мінск. 1967. С.81-93.
7. Сабаленка, Э.Р.Этнаграфічная спадчына Якуба Коласа. Мінск: Навука і тэхніка. 1969. 132 с.
8. Іваноў, У.М. Сучасны шлюб і вяселле ў рабочых // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. грамад. навук. 1959. № 2. С. 160-166.
9. Иванов, В.М. Современный быт рабочих города Минска: Автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.07 /АН УССР, Ин-т искусствоведения, фольклора и этнографии. Киев. 1961. 21с.
10. Ткачэнка, В.М. Аб шляхах ліквідацыі рэштkаў бытавой няроўнасці жанчын // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1963. № 4. С. 20-27.
11. Іваноў, У.М. Рэшткі бытавой няроўнасці жанчын і меры па хутчэйшай іх ліквідацыі // Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: В.К.Бандарчык і інш. Мінск. 1967. С.20-29.
12. Иванов, В.М. Семья и семейный быт рабочего класса Белоруссии XIX в. – 1970 гг.: Автореф. дис. …д-р ист. наук: 07.00.07 / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. Минск. 1971. 50 с.

13. Никольский, Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. Минск: Изд-во Акад. наук БССР. 1956. 273 с.
14. Довнар-Запольский, М.В. Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках // Довнар-Запольский М.В. Исследования и статьи. – Киев: Изд. А.П.Сапунова, 1909. С.61-146.
15. Пилипенко, М.Ф. Семья и брак у белорусских крестьян во второй половине XIX-нач. XX в.: Автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.07/ Моск. гос. ун-т. М. 1970. 20 с.
16. Бандарчык, В.К.Вывучэнне сямейнага і грамадскага быту беларусаў // Бандарчык В.К. Гісторыя Беларускай Савецкай этнаграфіі. Мінск: Навука і тэхніка. 1972. С. 121-139.
17. Изменения в быту и культуре городского населения Белоруссии / Под ред. В.К.Бондарчика. Минск: Наука и техника. 1976. 111 с.
18. Изменения в быту и культуре сельского населения Белоруссии / Под ред. В.К.Бондарчика. Минск: Наука и техника. 1976. 144 с.